# МОЙ РОДНЫ КУТ



# Урывак з паэмы «Новая зямля» Якуба Коласа



Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!
Не раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае убогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю.
О, як бы я хацеў спачатку
Дарогу жыцця па парадку
Прайсці яшчэ раз, азірнуцца,
Сабраць з дарог каменні тыя,
Што губяць сілы маладыя, –
К вясне б маёй хацеў вярнуцца.

*Нездарма я пачала радкамі аднаго з вядомых класікаў беларускай літаратуры Якуба Коласа, які стварыў прыгожае і чароўнае апісанне свайго роднага куточка ў паэме «Новая зямля». У кожнага, хто будзе чытаць гэты твор, узнікнуць вобразы роднага краю, у якім «душою слачываем», «душою ажываем».*



У творы «Новая зямля» падрабязна і дэталёва апісаны луг, поле, лес, прычым, у розныя поры года. Створыцца ўражанне, нібы сапраўды пабываў у кожным з апісаных аўтарам куточкаў, а таксама ўявіш свае прыгожыя мясціны.



У творы аўтар па-майстэрску, з веданнем справы апісвае побыт, працу, занятак селяніна, расказвае пра сялянскія будні і святы.



«Новая зямля» пачынаецца словамі, якія ідуць з самага сэрца, з самых патаемных куточкаў паэтавай душы:

*Мой родны кут, як ты мне мілы!..*
*Забыць цябе не маю сілы!..*





Пры чытанні паэмы перад вамі паўстане дружная чародка дубоў, а на адным з іх – буслы.








Вы ўбачыце, што прырода ў паэме адухоўленая і быццам жыве сваім жыццём, яна выказвае настрой чалавека, пачуцці аўтара.

*Вельмі дакладна, яркімі дэталямі паэт малюе луг, які шырока раскінуўся па абодва бакі Нёмана. Чытаючы радкі, прысвечаныя лугу, уявіш сябе сярод мурожных траў, адчуеш пахі сонца, травы, лёгкія павевы цёплага ветрыку:*

*Эх, луг шырокі!*
*Як жывы ты,*
*Праменнем сонейка заліты,*
*Увесь стаіш перад вачыма...*

# Героямі твора з’яўляюцца Міхал, Ганна і Антось



***Міхал -*** *галоўны герой паэмы. Працуючы леснікам у бязмежных уладаньнях князя Радзівіла, ён вымушаны нізка схіляць галаву перад панамі, рабіць усё, што загадаюць. Аднак на кожным кроку ён чуе знявагі, бачыць пагардлівыя адносіны да сябе. Усё гэта выклікае ў ягонай душы гарачы пратэст. Больш за ўсё Міхал хоча сам быць гаспадаром свайго лёсу.*

***Ганна** - жонка Міхала, тыповы прыклад гаспадарлівай беларускай сялянкі, працаўніцы, клапатлівай маці. Хоць яна і не пярэчыць мужу, але і не надта верыць, што ён сапраўды здолее такім шляхам атрымаць незалежнасць ад панскай улады.*



***Дзядзька Антось*** *– брата Міхала і верны яго памочнік ва ўсіх справах.*
*Ён тонкі псіхолаг, які ўмее падысці да дзіцяці, уздзейнічаць на непаслухмянага:*



*Ён быў настаўнікам, суддзёю,*
*Калі, бывала, між сабою*
*Паспрацць дзеткі ці паб'юцца,*
*Дык да каго тады звярнуцца,*
*Як не да дзядзькі, да Антося?*



# Паэма прысвечана апісанню сялянскага побыту

Ежа ў сялянскай хаце — гэта цэлы абрад са строга ўстаноўленымі правіламі і парадкам. За сталом збіраліся абавязкова ўсе члены сям'і. Кожны займаў свае месца. У кут звычайна саджалі пачэснага госця. Малыя дзеці, якія яшчэ не ведалі парадку, елі асобна. За сталом жа сядзелі дарослыя, панавалі цішыня і парадак, адчувалася павага да ўсяго таго, што знаходзілася на стале, як здабытку цяжкай працы.

*Якуб Колас пакінуў нам, сваім нашчадкам, запавет: любіць і ахоўваць прыроду, разумна выкарыстоўваць яе багацці, ствараць вакол сябе прыгожае, захапляцца дзіўным хараством, што знаходзіцца вакол нас, але якое мы не заўжды ўмеем заўважыць і ацаніць. не мае роўных сабе ў нацыянальнай літаратуры па глыбіні, прыгажосці і замілаванні ў мастацкім апісанні роднай прыроды і сялянскага жыцця.*



*Паэма «Новая зямля» не мае роўных сабе ў нацыянальнай літаратуры па глыбіні, прыгажосці і замілаванні ў мастацкім апісанні роднай прыроды і сялянскага жыцця.*

*Таму неабходна кожнаму сапраўднаму беларусу прачытаць гэты незвычайны і цікавы твор, ацаніць спадчыну, пакінутую нашым вядомым класікам Якубам Коласам.*



# Дзякуй за ўвагу